# ЛІТЕРАТУРОЗНАВСТВО

## КОМПАРАТИВІСТИКА

УДК 821.161.3–4:821.161.2–4

**Бажок І. А.**,
аспірантка,
Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны
(Беларусь)

## ЖАНРАВА-ТЭМАТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ І ЎКРАІНСКАЙ ЭСЭІСТЫКІ

Нягледзячы на шматгадовую гісторыю эсэ, грунтоўныя даследаванні, прысвечаныя гэтаму жанру, пачалі з'яўляцца толькі ў 21 стагоддзі. Знаходжанне эсэістыкі па-за межамі класічных родаў эпасу, лірыкі і драмы перашкаджае літаратуразнаўцам "упісаць" яе ў існуючую яшчэ са старажытнасці сістэму. Аднак спробы прааналізаваць эсэістычныя творы, выявіць іх спецыфіку і раскрыць сутнасць жанра рабіліся неаднаразова. Унікальнасць і своеасаблівасць эсэістычных твораў нарадзілі ў літаратуразнаўчых і крытычных колах align рознабаковыя трактоўкі, разнастайныя крытычныя думкі і не звязаныя адной ідэяй выказванні. Блытаніна ў жанравых дэфініцыях прывяла да таго, што да эсэ адносілі творы, якія не адпавядалі жанравым канонам. З другога боку, гэтым жанрам падпісаныя сачыненні, якія адносяцца да іншых жанравых разнавіднасцей (мемуары, лісты, гутаркі, развагі, споведзі, трактаты, дзённікі).

У беларускім літаратуразнаўстве на сённяшні момант адсутнічае манаграфічнае даследаванне жанру эсэ, некаторыя заўвагі і думкі наконт разглядаемай праблемы можна знайсці ў артыкулах з перыядычнага друку, літаратуразнаўчых даведніках, а таксама ў падручніках па тэорыі і гісторыі літаратуры. Да разгляду эсэ ў Беларусі звярталіся такія даследчыкі, як В. Акудовіч, Л. Баршчэўскі, П. Васючэнка, М. Тычына, Г. Кісліцына. Сярод расійскіх навукоўцаў, якія займаліся распрацоўкай тэмы, – Я. Зыкава, А. Мураўёў, А. Эльяшэвіч, А. Іваноў, М. Эпштэйн, В. Халізеў і інш.Ва ўкраінскім літаратуразнаўстве кароткія характарыстыкі жанру ёсць у падручніках па тэорыі літаратуры, крытычных даведніках, артыкулах (І. Булкіна, Л. Стэфаніўскі, А. Гнацюк, А. Баган, С. Квіт і інш.). Акрамя таго, эсэ з'явілася прадметам даследавання некалькіх кандыдацкіх дысертацый.

Праблема вызначэння жанра эсэ і яго функцыянавання ў мастацтве слова з'яўляецца актуальнай у літаратуразнаўстве. Прадмет даследавання – эсэістычныя творы беларускіх і ўкраінскіх пісьменнікаў. Дадзеная работа знаходзіцца ў полі кампаратывістычных даследаванняў і вызначае жанрава-тэматычныя асаблівасці эсэ суседніх усходнеславянскіх літаратур.

Вядомы беларускі даследчык М. Тычына адзначае, што "ўсходнеславянская і агульнаеўрапейская гісторыка-культурная прастора, складовай часткай якой

і з'яўляецца беларуска-ўкраінская міжлітаратурная супольнасць, можа ўспрымацца як структурна-арганізаваная і дынамічная сістэма з усімі прыкметамі, характэрнымі для жывой цэласнасці" [6, 29]. Сапраўды, гісторыя развіцця беларускай і ўкраінскай літаратур цалкам пацвярджае гэты тэзіс.

У апошняе дзесяцігоддзе паміж беларускімі і ўкраінскімі творцамі назіраецца цеснае супрацоўніцтва. Здзяйсняюцца шматлікія пераклады з беларускай на ўкраінскую мовы і наадварот паэзіі, прозы, драматургіі і эсэістыкі. Асабліва цесныя перакладчыцкія кантакты наладжаныя паміж сучаснымі лідэрамідзвюх літаратур – А. Хадановічам і Ю. Андруховічам.

Адной з галоўных задач кампаратывістыкі з'яўляецца "выяўленне мастацкай і эстэтычнай вартасці, каштоўнасці пэўнай нацыянальнай літаратуры ў кантэксце дасягненняў літаратуры сусветнай" [4, 7]. Так, толькі пры супастаўленні становіцца відавочнай унікальнасць таго ці іншага твора.

**Мэтай** даследавання з'яўляецца выяўленне адметных і агульных рыс эсэістычных твораў беларускіх і ўкраінскіх аўтараў.Мэта можа быць дасягнута пры вырашэнні наступных задач: прасачыць тэндэнцыі зараджэння, станаўлення і развіцця жанра ў беларускай і украінскай літаратуры; вызначыць залежнасць дамініравання жанравых уласцівасцей ад гісторыка-літаратурнага перыяду ўзнікнення твора; ахарактарызаваць жанрава-тэматычныя асаблівасці эсэістычных твораў дзвюх літаратур у розныя перыяды іх развіцця.

Зараджэнне эсэістычных традыцый у мастацтве слова звязана з антычнасцю. Ужо ў працах Цыцэрона, Плутарха, Сенэкі, Платона, Ісакрата, Марка Аўрэлія з'яўляюцца першыя рысы эсэ: яскрава выражаны аўтарскі пачатак, асацыятыўнасць, вобразнасць, аргументаванасць (сістэма тэзісаў і доказаў). Эсэ як самастойная жанравая форма склалася ў эпоху Адраджэння, калі цэнтрам мастацтва і філасофіі стаў Чалавек. Сучаснае літаратуразнаўства амаль адзінагалосна прызнае першым творам у жанры эсэ "Essai" французскага пісьменніка-філосафа Мішэля дэ Мантэня. Аднак памылкова будзе сцвярджаць, што гэты тэкст паўплываў на зараджэнне беларускай (ды і ўкраінскай) эсэістыкі. Першы пераклад "Вопытаў" на рускую мову быў ажыццёўлены толькі ў 1954 годзе. Магчыма, што ўсходнеславянскімі культурнымі дзеячамі быў прачытаны арыгінал, але гэта можна ўявіць гіпатэтычна.

Імкненне старажытных пісьменнікаў да яскрава акрэсленых жанравых канонаў стрымлівала ўзнікненне новых жанраў. В. А. Чамярыцкі лічыць, што "для старажытнага часу больш характэрна імкненне да традыцыйнага і ўмоўнага, да ўсталяваных норм і ўзораў, да гатовых мастацкіх форм і стылістычных трафарэтаў, да старога захавання агульнапрынятых, асвечаных часам і аўтарытэтам продкаў этычных і эстэтычных правіл і прынцыпаў, літаратурнага этыкету" [7, 55]. Старажытная літаратура мае канкрэтныя жанры (жыціі, пасланні, словы, малітвы і інш.), сярод якіх эсэ не сустракаецца.

Самая відавочная прычына, якая стрымлівала эсэізацыю тэкстаў, – хрысціянізацыя. У літаратуры дзейнічаў прынцып: не "Я" гавару, а Бог гаворыць вуснамі прамоўцы. У жанры ж эсэ "Я" – галоўны і адзіны суб'ект. Робячы гістарычны

агляд украінскай эсэістыкі, С. Шэбеліст заўважае сітуацыю, аналагічную беларускай. Па словах даследчыка, эсэ доўгі час не было ўласціва украінскай літаратуры і публіцыстыцы, паколькі ў ім на першы план выходзіць аўтарская індывідуальнасць з дамінантным "Я", уласнымі перакананнямі і манерай выказвання. Акрамя таго, даследчык выказвае і яшчэ адну арыгінальную і слушную думку: "Людина, котра вільно мислить і вербалізує свої думки, була небезпечною для імперської чи тоталітарної влади. Крімтого, есей не приживався на східнослов'янських теренах, позаяк його вважали "чужим", суто західноєвропейським жанром. Натомість панував споріднений і популярний нарис" [9, 86].

Аднак можна з упэўненасцю гаварыць пра адзнакі эсэістычнага жанру ў старажытных тэкстах, вызначыць базу, на якой ствараліся першыя беларускія і ўкраінскія эсэ. Вылучаць "нацыянальных пісьменнікаў" у старажытнай ў сходнеславянскай літаратуры прыблізна да 17 стагоддзя (да часу фарміравання асобных моў) не варта. Таму і жанрава-тэматычныя асаблівасці твораў былі прыкладна аднолькавымі.

Адзнакі эсэістычнага жанру ў беларускім пісьменстве з'явіліся ў 12 стагоддзі. Найбольш спрыяльнымі ўмовамі для выказвання асабістага меркавання аўтара варта лічыць творы палемічнай літаратуры.

Адной з яскравых постацей старажытнай беларускай літаратуры з'яўляецца К. Тураўскі. У сваіх творах ён выкарыстоўваў звароты, разгорнутыя ўводзіны, лагічную структуру, параўнанні, паралелі, прыклады. У тэкстах назіраецца яскравы падзел на думкі аўтара і словы Госпада. Самы эсэізаваны твор К. Тураўскага – "Прытча пра чалавечую душу і цела, або пра сляпога і бязногага". Тэматыка твораўне проста біблейская, але і дапоўненая аўтарскімі выказваннямі пра карысць чытання кніг ("Прытча"), місію зямнога існавання чалавека ("Слова пра чалавека і пра нябесныя сілы"), рысы характару чалавека – сціпласць, міласэрнасць, спагаду ("Слова на Пяцідзесятніцу"), выхаванне добрых нораваў ("Парада").

На тэрыторыі сучаснай Украіны ў 12 стагоддзі з'явілася "Аповесць мінулых гадоў", напісаная манахам Кіева-Пячорскага манастыра Нестарам. Адзнакі эсэ – у тлумачальнай манеры апавядання. Тэматыка твора гістарычная, але з моцным патрыятычным пафасам. Так, у "Павучанні Уладзіміра Манамаха сваім дзецям" аўтар дае настаўленні нашчадкам быць мудрымі, дзейснымі, любіць прасвету.

У эпоху Адраджэння развіццё літаратуры стала больш дынамічным і дэмакратычным. Увага да чалавека праявілася ў двух асноўных варыянтах: па-першае, літаратура станавілася больш свецкай з'явай, па-другое, у цэнтры ўвагі аўтара знаходзілася асоба чалавека.

Ф. Скарына ў "Прадмове да ўсёй "Бібліі" тлумачыць карысць кнігі з боку практычнага, свецкага яе прымянення. Пісьменнік выкарыстоўвае разгорнутыя параўнанні, сінтаксічны паралелізм.

У станаўленні ідэі самапазнання ў беларускай літаратуры этапным творам

стаў "Катэхізіс, або Навука старадаўняя хрысціянская ад святога пісьма, для простых людзей мовы беларускай у пытаннях і адказах сабраная" С. Буднага. Структура твора ўяўляе сабой чаргаванне пытанняў і адказаў. Такая форма дае магчымасць аўтару не толькі звярнуць увагу на хвалюючыя пытанні, але і выказаць уласную думку, якая выглядае заўсёды правільнай.

Яшчэ адна форма, якая дае магчымасць выказаць уласны погляд на праблемы рэчаіснасці – спрэчка. У "Апісанні сінода ў Іўі 1568 г.", запісаным С. Будным, вядзецца дыскусія паміж аўтарытэтнымі асобамі пра "падданых і нявольную чэлядзь". Традыцыі С. Буднага працягнуў Л. Зізаній.

Украінская эсэізаваная літаратура перыяду Адраджэння мала адрознівалася жанрава, але значна разнастайней была тэматычна. На гэта паўплывалі гістарычныя падзеі. Палемічная літаратура акрамя спрэчак на рэлігійную тэматыку, раскрывала глабальныя пытанні барацьбы ўкраінскага народа з польскімі акупантамі (напрыклад, "Апокрысіс або водпаведзь на кніжкі пра сабор берасцейскі" Хрыстафора Філалета, псеўданім). Літаратура набліжалася да публіцыстыкі. У тэкстах гучала сатыра, іронія, якая значна адрознівала ўкраінскія творы ад падобных беларускіх.

"Палінодыя, або кніга абароны" Захарыя Капісценскага – выдатны па сістэматычнасці выкладу і абгрунтаванасці доказаў эсэістычны твор, напісаны жывой мовай з мноствам прымавак і сатырычных выказванняў.

Знакавай падзеяй старабеларускай літаратуры эпохі барока стала творчасць Кірылы Транквіліёна-Стаўравецкага. Спалучаючы ў сабе талент літаратара, філосафа, прапаведніка і багаслова, гэты чалавек карэнным чынам змяніў уяўленні тагачаснага чытача аб законах прыроды, духоўнага свету і ведах. К. Транквіліён-Стаўравецкі не навязваў уласнае меркаванне, не напаўняў свае творы дыдактычнымі павучаннямі, а вельмі лагічна, доказна, разумна выкладаў прынцыпы ўласнага светабачання. Навуковыя высновы аб колазвароце вады ў прыродзе, аб марскіх прылівах і адлівах, аб эвалюцыйным развіцці жыцця на Зямлі сталі вядучымі і аднымі з першых у Еўропе. Да жанру эсэ прымыкае навукова-папулярны твор К. Транквіліёна-Стаўравецкага "Люстра Багаслоўя", надрукаваны ў 1618 годзе.

Ва ўкраінскай літаратуры такой знакавай постаццю стаў Іван Вішанскі. Аднак творы пісьменніка былі больш публіцыстычныя, напісаныя жывой украінскай мовай, насычанай неалагізмамі. Пісьменнік выкрывае багацце ўкраінскай шляхты, царкоўных магнатаў, выступае супраць усяго новага з Захаду, негатыўна адносіцца да фальклору, свецкай навукі, тэатральных пастановак. Смеласць аўтара, доказнасць, індывідуальнасць высноў набліжае творы І. Вішанскага да эсэістычных.

Вытокі ўкраінскай эсэістыкі можна прасачыць у пропаведзях І. Галятоўскага, Л. Барановіча, Д. Туптала, Р. Скаварады і інш.

Новымі філасофскімі поглядамі ўзбагаціў літаратуру Сімяон Полацкі. У сваіх вершаваных сентэнцыях пісьменнік прапагандуе ідэі розуму, навукі, працы і інш.

Ад старажытных тэкстаў беларуская і ўкраінская эсэістыка 20–21 стагоддзяў пераняла структурызацыю, выкарыстанне пачатковага тэзіса (парадокса), разгалінаваную і прадуманую сістэму доказаў, разважлівасць, звароты да чытача, эмацыянальнасць.

Адзнакі і элементы эсэістычнага стылю ў 19 стагоддзі сустракаюцца ў дзённікавых і літаратурна-крытычных творах Т. Шаўчэнкі, І. Нячуя-Лявіцкага, І. Франко. У беларускай літаратуры такіх прыкмет жанру ў гэты час амаль не было.

Станаўленне і развіццё ўкраінскай і беларускай эсэістыкі пачалося ў пачатку 20 стагоддзя, калі і ў Беларусі, і ва Украіне адбывалася нацыянальнае адраджэнне. С. Шэбеліст адзначае, што "Провідніінтелектуали того часу прагнули до оновлення культури,а відтак активно засвоювали нові стилі та жанри" [9, 86]. Важным сродкам у справе развіцця эсэістыкі стаў часопіс "Літературно-науковий вісник", з якога выйшла цэлая школа эсэістаў – Я. Маланюк, Ю. Ліпа, Л. Мосендз, Д. Віконска. Ідэнтычная сітуацыя адбывалася і ў беларускіх культурных колах. Эсэізм характэрны публіцыстычным творам Я. Купалы ("Вера і нацыянальнасць"), Я. Коласа ("Думкі ў дарозе"), М. Багдановіча ("Краса і сіла", пра творчасць Т. Шаўчэнка), Цёткі ("Аб душы маладзёжы"), А. Бабарэка ("Разважанні N-скага"). Тэматыка тэкстаў – грамадзянская, філасофская і літаратуразнаўчая, а для стыля характэрны эмацыянальнасць і рытарычнасць.

Першы беларускі твор, напісаны ў жанры эсэ, – "Адвечным шляхам" (1921) І. Абдзіраловіча. Гэта кніга з'яўляецца ўнікальнай у гісторыі беларускай літаратуры. Даследчыкі вызначаюць жанр твора як мастацка-філасофскае эсэ, аднак тэкст настолькі разнастайны, што ўключае ў сабе адзнакі тэарэтычнага, спрэчнага, апавядальнага, тлумачальнага, апісальнага, інфарматыўнага і крытычнага эсэ. Твор структурыраваны, складаецца з загалоўка, эпіграфа, прысвячэння, уступу і чатырох частак. Падзагаловак "Даследзіны беларускага светагляду" вызначае накірунак інтэлектуальнага асэнсавання праблемы, г. зн. беларускай ідэнтычнасці і менталітэту. Пралемы, якія аўтар закранае ў эсэ, вельмі разнастайныя: феномен сацыяльных і гістарычных форм, аўтарытэты, мода, дысцыпліна, інертнасць, традыцыі, ідэалы, выхаванне, мастацтва, масавасць, палітыка, ахвяраванне, трансфармацыя біблейскіх прынцыпаў і інш. Эсэ было перавыдадзена толькі ў 1989 годзе, таму атрымалася парадаксальная сітуацыя: кніга, якая мае ключавое значэнне ў фарміраванні нацыянальнай эсэістычнай традыцыі, у самы плённы перыяд літаратурнага развіцця ў Беларусі – 20 ст. – заставалася схаванай і невядомай.

У 1924 годзе было выдадзена эсэ Сулімы (У. Самойлы) "Гэтым пераможаш!..". Тут знайшлі адлюстраванне ідэіФіхтэ з яго "філасофіяй свабоды", біблейская філасофія, тэорыя Духа па Гегелю, развагі Канта пра "абсалютнае зло", схема "злачынства – пакаранне" Ф. Дастаеўскага і інш.

У. Конан у прадмове да другога выдання вызначае жанр твора па-рознаму. Так, спачатку гэта "философско-этический очерк" [2, 154], затым – "пророческое эссе" [2, 156], далей – "философское эссе" [2, 156] і яшчэ – "лекции" [2, 156]. Аўтар твора – Суліма – у падзагалоўку тэкста дае спасылку на жанр – "Очерк критического

оптимизма” [5, 158], хаця ўжо ў трэцяй частцы Суліма даказвае неабходнасць для беларусаў “лекций сознательного критического оптимизма” [5, 160].

Прыкладам жанру ў беларускай літаратуры з’яўляюццасуб’ектыўныя эсэ У. Жылкі. Іх вылучае парадаксальнасць. Тэмы смерці, Хаосу і Космасу, самаідэнтычнасці, Хараства, дня і начы значна ўзбагачаюцьпалітру эсэістыкі.

Калі ў беларускай літаратуры пачатку 20 стагоддзя ў жанры эсэ з’яўляліся адзінкавыя, але значныя творы, то ва ўкраінскай літаратуры эсэістыка развівалася паступова і станавілася традыцыйнай. Напрыклад, “Книга спостережень” Я. Маланюка ўключае шэраг арыгінальных суджэнняў пра літаратуру, праблемы украінска-расійскіх кантактаў, развіцця ўкраінскай культуры і нацыі.

Класіку ўкраінскага сацыял-нацыяналізму Юрыю Ліпе належыць адметнае эсэ “Українська жінка”. Аўтар разважае над унікальным вобразам першамаці, якая з’яўляецца выключным ідэалам і арыенцірам для ўкраінскага народа: “Бо жіночий первень, ця українська духовність-мати, має більше почуття власності на Україну, як первень чоловічий, більш фантастичний і поривистий” [3]. Пісьменнік прыводзіць мноства лагічных доказаў, важкасць факталагічнага матэрыялу нарастае паступова. Аўтар аддзяляе сябе ад патэнцыяльных чытачоў, займаючы пазіцыю “верную” на яго погляд. Ю. Ліпа вылучае, што ўкраінка адрозніваецца ад астатніх жанчын фізічнай любоўю да свайго і фізічнай нянавісцю да чужога ў светаглядзе і духоўнасці. Ёсць ва ўкраінскай літаратуры эсэ Ю. Ліпы “Призначення України” (1937) падобнае да беларускага эсэ “Адвечным шляхам”. Аўтар разгледзеў паняцце геапалітычных межаў украінскай тэрыторыі, гістарычных і псіхалагічных асноў фарміравання ўкраінскай ментальнасці. Твор складаецца з 14 раздзелаў, у кожным з якіх раскрываецца адна падтэма з прыкладамі і цытатамі. Падобная праблема разглядаецца ў публіцыстычным эсэ “Геополітичні орієнтири нової України”.

У далейшым украінская эсэістыка выдавалася за мяжой. Большасць беларускіх творчых інтэлектуалаў была расстраляна.

Для беларускай савецкай несюжэтнай прозы характэрна лозунгавасць, дыдактызм, бесканфліктнасць, апісальнасць, лірызм. Тэматыка эсэістычных твораў у асноўным літаратуразнаўчая і гістарычная. Сярод пісьменнікаў, творы якіх пазначалі тэрмінам “эсэ”, можна назваць М. Стральцова, Н. Гілевіча, У. Караткевіча, Р. Барадуліна, Я. Брыля. Варта адзначыць, што ў творчасці апошняга з’яўляецца дзіцячае эсэ, якое не атрымала далейшага развіцця.

Г. Швец у сваім дысертацыйным даследаванні адзначае, што асноўная тэматыка ўкраінскай эміграцыйнай прозы – гэта “осмислення особливостей українського менталітету, національної свідомості, причин трагічних моментів історії народу, русифікаторської політики більшовиків, послідовності в розвитку національних організмів” [8, 14]. Калі супаставіць эсэістыку Я. Брыля (беларускага пісьменніка) і В. Баркі (украінскага мастака слова), відавочнай становіцца жанрава-тэматычная процілегласць твораў: асаблівасці стылю першага выяўляюцца праз рытарычнасць, узнёсласць, адпаведную лексіку, а тэксты другога не вылучаліся камунікатыўнасцю, пазбаўлены павучальных элементаў,

зваротаў, заклікаў, не закранаюць надзённых пытанняў. Такім чынам, пакульбеларуская эсэістыка "працуе" на карысць існуючай ідэалогіі, украінскія эсэісты распрацоўваюць сваё кола тэм, не надта хвалюючых грамадства. У другой палове 20 ст. абедзве літаратуры перажываюць колькасны ўздым эсэістычных твораў, але губляюць іх мастацкую вартасць.

Сапраўдны ўсплёск эсэ адбыўся ў канцы 1980–1990-х гг., у перыяд станаўлення незалежнасці абедзвюх краін. Таму актуальнымі становяцца праблемы мовы, культуры, гістарычнай памяці, нацыянальнай ідэнтычнасці.

Знакавай з'явай у гісторыі беларускай эсэістыкі стала эсэ У. Арлова "Незалежнасць – гэта…", выснова твора гучыць наступным чынам: "Незалежнасць – гэта калі ад нараджэння да скону пачуваешся сваім чалавекам на сваёй зямлі" [1]. Твор быў напісаны ў лютым 1990 года і перакладзены больш як на 20 моў свету. Як справядліва заўважыў украінскі пісьменнік А. Ірванец, стыль эсэ У. Арлова вельмі нагадвае маніфест.

Моцная нацыянальная ідэя гучыць і ва ўкраінскай эсэістыцы. Прыкладам можа служыць эсэістыка Густава Вадзічкі ("Анафема республіці", "Ворог не візьме наш гордий народ!", "Кордони раю", "Немовлята гриль", "Портрет грядущого Цезаря", "Селекція за грозою").

Сёння эсэістыка – з'ява масавая, папулярная і актуальная. Сярод мноства эсэістычных тэкстаў сустракаюцца як грунтоўныя, "прыкладныя" эсэ, так і выпадковыя, напісаныя спецыяльна для адпаведных конкурсаў. Назіраецца эсэізацыя ўсіх літаратурных жанраў (напрыклад, раманы-эсэ А. Бахарэвіча, Ю. Андруховіча), літаратуразнаўчая крытыка таксама стала эсэізаванай (І. Штэйнер, І. Шаўлякова, Л. Галубовіч, О. Бойчанка, І. Бондар-Цярэшчанка), філасофскія развагі пазначаюць тэрмінам "эсэ" (В. Акудовіч, М. Марыновіч), гістарычныя пытанні разглядаюцца ў форме эсэ (В. Казько, Ю. Шапавал) і інш.

Гісторыя беларускай і ўкраінскай эсэістыкі мае парабалічны характар. Характэрныя рысы жанра былі ўласцівыя ўжо старажытным тэкстам. У ранніх творах пераважала гістарычна-рэлігійная тэматыка. Эпоха Адраджэння ўзбагаціла літаратуру гуманістычнай праблематыкай, у эсэістычных творах выказваліся ўласныя меркаванні аўтара наконт анталагічных пытанняў, мова стала больш метафарычнай. Украінскія эсэізаваныя творы гэтага перыяду значна багацейшымі былі тэматычна, тэксты адрозніваліся наяўнасцю сатыры і іроніі. Эсэістычны пачатак у творах узнацніўся ў эпоху барока. Першыя прыклады жанра з'явіліся ў пачатку 20 стагоддзя – разгорнутыя структурыраваныя мастацкія эсэ, прысвечаныя нацыянальнаму адраджэнню. Расстрэлы беларускай інтэлігенцыі прывялі да таго, што творы ў жанры эсэ былі адзінкавымі, украінская ж эсэістыка паступова развівалася ў эміграцыі. У савецкі перыяд назіраецца жанрава-тэматычная процілегласць твораў. Пачынаючы з канца 1980-х гадоў эсэ становіцца папулярным жанрам, асноўная частка тэкстаў прысвечана праблеме нацыянальнай ідэнтычнасці. Сучасныя ўкраінскія і беларускія эсэ характарызуюцца плюралізмам стылей, тэм і праблем.

### Літаратура

1. Арлоў У. Незалежнасць – гэта... : [эсэ] [Электронны рэсурс] / У. Арлоў. – Рэжым доступу : http://library.by/portalus/modules/belprose/readme.php?subaction=showfull&id=1096216187&archive=&start_from=&ucat=23&.
2. Конон В. Пророк в своём отечестве / В. Конон // Нёман. – 1992. – № 1. – С. 154–157.
3. Липа Ю. Українська жінка [Електронний ресурс] / Ю. Липа // Жінка. – № 7–8 (квітень). – 1938. – С. 2–4. – Режим доступу : http://www.vatra.cc/rasa/yuriy-lypa-ukrayinska-zhinka.html.
4. Мельнікава А. Беларуская літаратура 20 стагоддзя ў еўрапейскім кантэксце / А. Мельнікава. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2007. – 124 с.
5. Сулима. Сим победиши!.. / Сулима // Нёман. – 1992. – № 1. – С. 158–187.
6. Тычына М. Карані : культуралагічны дыскурс / М. Тычына // Нарысы беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязей : культ.-гістар. і літ. аспекты праблемы. – Мінск : Беларуская навука, 2002. – С. 10–64.
7. Чамярыцкі В. Літаратура XIV – пачатку XVI ст. / В. Чамярыцкі. – 3-е выд. стэрыятып. // Гісторыя беларускай літаратуры : старажытны перыяд : [вучэб. дапам. для філал. фак. пед. ВНУ]. – Мінск : Выш. шк., 1997. – С. 53 – 85.
8. Швець Г. Ессеїстика Василя Барки : жанрова специфіка та проблематика : автореф. дис. … к. філол. н. : 10.01.01 "Українська література" / Г. Швець. – Київ, 2006. – 20 с.
9. Шебелист С. Сучасна українська есеїстика (1990–2000 рр.) [Электронны рэсурс] / С. Шебелист // Журналістыка. – 2007. – Рэжым доступу : http://elib.bsu.by/handle/123456789/19154.

### Аннотация

В статье выявлены историко-литературные особенности и общие черты эссеистических произведений белорусских и украинских авторов. Отражены тенденции зарождения, становления и развития жанра в двух славянских литературах. Автор определяет зависимость доминирования жанровых черт от историко-литературного периода возникновения произведения. Приведена характеристика жанрово-тематических особенностей эссеистических произведений белорусской и украинской литератур в разные периоды развития искусства слова.

**Ключевые слова:** эссе, жанр, тематика, становленне, характерные черты.

### Анотація

У статті виявлені історико-літературні особливості та загальні риси есеітичних творів білоруських та українських авторів. Відображені тенденції зародження, становлення і розвиття жанру в двух славянських літературах. Автор визначає залежність домінування жанрових рис від історико-літературного періоду виникнення твору. Приведена характеристика жанрово-тематичнихособливостейесеітичних творів білоруської та української літератур в різні періоди розвитку мистецтва слова.

**Ключові слова:** ессе, жанр, тематика, становлення, характерні риси.

### Summary

The article reveals the historical and literary features and general features of essay works of Belarusian and Ukrainian authors. Trends of origin, formation and development of the genre in the two Slavic literatures are reflected. The author defines the dependence of the dominance of the genre features of the historical and literary period of work. The characteristics of the genre and thematic features essay works of Belarusian and Ukrainian literatures in different periods of development of the art of the spoken word are shown.

Keywords: essays, genre, themes, development, characteristic features.